LIETUVOS RESPUBLIKOS ŠVIETIMO IR MOKSLO MINISTERIJA
NACIONALINIS EGZAMINŲ CENTRAS

2008

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА
## (BALTARUSIŲ KALBA)

## Тэмы і пытанні
## (Kalbėjimo temos ir klausimai)

**Праверачныя заданні 2008 г. за курс асноўнай школы**

**2008 m. pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduotis**

**13 чэрвеня 2008 г.**

**ТЛУМАЧЭННІ:**

- Вучань павінен выбраць адно пытанне з некалькіх па загадзя абранай ім тэме.
- Вучань рыхтуецца 20 хвілін, адказвае па выбранаму пытанню 3 – 5 хвілін і да 5 хвілін гутарыць з экзаменатарам.
- Экзаменатар ацэньвае адказ вучня, кіруючыся крытэрыямі і нормамі ацэнкі, якія дадзены ў табліцы ацэнкі, а балы ўпісваюцца ў пратакол ацэнкі вуснага выказвання.

© Nacionalinis egzaminų centras, 2008

# Тэмы і пытанні

## I. Кулінарнае мастацтва і штодзённасць

1. Як Вы разумееце, што такое “мастацтва”?
2. Чаму кулінарыю называюць мастацтвам? Паразважайце на гэту тэму.
3. На Вашую думку, ці ёсць у паўсядзённасці месца **кулінарнаму** мастацтву? Адказ абгрунтуйце.
4. Раскажыце, што Вы ведаеце пра прафесію кулінара.

## II. Традыцыі і сучаснасць

1. Паразважайце, якое значэнне ў жыцці кожнага народа маюць традыцыі.
2. Якія беларускія традыцыйныя святы Вы ведаеце? Прывядзіце прыклад.
3. Раскажыце пра традыцыі Вашай школы.
4. Якія традыцыі шануюцца ў Вашай сям’і?

## III. Дарогі, якія мы выбіраем

1. Як Вы думаеце, чаму часта жыццё ўяўляюць у выглядзе дарогі?
2. Паразважайце над сэнсам фразы “Дарогі, якія мы выбіраем”.
3. Ці любіце Вы падарожнічаць? Чаму?
4. Раскажыце пра паездку, якая Вам найбольш запомнілася.

## IV. Горад. Вуліцы. Гісторыя

1. Як Вы думаеце, чаму праз гісторыю вуліц горада пазнаецца гісторыя народа?
2. Якія вуліцы Вашага горада звязаны з гістарычнымі падзеямі? Прывядзіце прыклад.
3. Вуліца майго дзяцінства. Якая яна?
4. Раскажыце гісторыю вуліцы, на якой Вы жывяце.

================